ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

25 ЧЭРВЕНЯ 1933 г. № 137 (2014)

# ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

Цана № 5 кап.

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

# Радыеграма

## Старшыням РВК, дырэктарам леспрамгасаў, загадчыкам сплаўкантор і сплаўвучасткаў

28 чэрвеня СНК БССР праводзіць усебеларускі радыёмітынг па пытаньню ходу дровалесавывазак і лесаплаву. На мітынгу павінны выступіць з дакладамі аб выкананьні пляну лесавывазкі і лесасплаву старшыні РВК, дырэктары ЛПГ, загадчыкі сплаўкантор і вучасткаў.

Прапаную стварыць рашучы перелом у ходзе работы, забясьпечыўшы сустрэчу мітынга поўным выкананьнем плянаў лесавывазкі і лесасплаву.

Шырока папулярызуйце значэньне гэтага мітынгу сярод лясных і сплаўных рабочых, членаў сельсаветаў, колгасьнікаў, аднаасобнікаў, мобілізаваўшы іх на пасьпяховае выкананьне плянаў лесавывазкі і лесасплаву, таксама на ўдзельнічаньне іх у мітынгу шляхам організацыі масавага колектыўнага слуханьня.

Старшыня СНК Галадзед.